■ Ёсць нагода

# Скарына цяпер і ў... Амерыцы

## Яго кнігі перададзены бібліятэкам Злучаных Штатаў

**Днямі дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ наведаў найбуйнейшыя бібліятэкі ЗША: Бібліятэку Кангрэса ЗША і Нью-Ёркскую публічную бібліятэку і перадаў ім факсімільныя выданні — «Кніжная спадчына Францыска Скарыны». У цырымоніі перадачы кніг прынялі ўдзел часовы паверены ў справах Беларусі ў ЗША Павел Шыдлоўскі і Генеральны консул Беларусі ў Нью-Ёрку Віктар Саверчанка.**

Урачыстасць была прымеркавана да 500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Гэтым крокам амерыканскія арганізатары імкнуліся пашырыць нашы культурныя сувязі, а таксама распаўсюдзіць інфармацыю пра культуру Беларусі ў бібліятэчнай супольнасці ЗША.

Варта адзначыць, што Нацыянальная бібліятэка Беларусі яшчэ ў 2013 годзе ініцыявала агульнанацыянальны праект факсімільнага перавыдання кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Ужо праз год сумесна з Банкам БелВЭБ удалося рэалізаваць яго першую частку — пабачылі свет пяць першых тамоў выдання. На сённяшні дзень камплект «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» ўключае 11 тамоў.

Кнігі па меры выхаду перадаюцца ў навуковыя, навучальныя, культурныя, грамадскія арганізацыі Беларусі і замежных краін. Першыя асобнікі ўжо трапілі ў бібліятэкі Вялікабрытаніі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Чэхіі.

Шматтомнае факсімільнае выданне з'яўляецца сапраўдным культурным здабыткам беларускага народа. У яго ўваходзіць поўны камплект кніг, надрукаваных Францыскам Скарынам у Празе (1517—1519 гадах) і Вільні (1522—1525 гадах). У яго аснове — электронныя копіі тых кніг першадрукара, якія захаваліся і знаходзяцца ў бібліятэках і музеях Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі і іншых краін.

Факсімільнае выданне максімальна поўна ўзнаўляе спадчыну першадрукара. Яно суправаджаецца каментарыямі навукоўцаў, а таксама перакладамі прадмоў і пасляслоўяў Францыска Скарыны на сучасныя беларускую, рускую і англійскую мовы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

# ПАНТЭОН АЙЧЫНЫ

*Падавайце ж потомкам, что маете з предков.*
**Андрэй РЫМША.**

## Брачыслаў Ізяслававіч (?—1044)



Мастак А. КРЫВЕНКА.

Аб жыцці князя Брачыслава Ізяслававіча летапісы пакінулі некалькі радкоў. Вядома, што ў 1021 годзе Брачыслаў заваяваў Ноўгарад. На зваротным шляху ў Полацк ён сустрэўся на рацэ Судоме з войскам кіеўскага князя Яраслава і быў пераможаны. Указвалі летапісы і год смерці Брачыслава — 1044-ты.

Амаль палову стагоддзя ўладарыў Брачыслаў у Полацку, і гэты час нам невядомы. Можна толькі здагадвацца, што адбывалася ў гэты перыяд. Гэтак, аналізуючы «Сагу аб Эймундзе», прыходзім да высновы, што ў Полацку была моцная ўлада веча. Брачыслаў па сутнасці з'яўляўся выканаўцам вечавых пастаноў. Веча мела заканадаўчую ўладу, заключала дамовы, слала пасольствы. Менавіта веча прыняло на службу Полацку варажскую дружыну Эймунда. З «Сагі...» даведваемся, што вайну з Полацкам першы пачаў кіеўскі князь Яраслаў. Ён прыслаў Брачыславу патрабаванне ўступіць частку зямлі. Але Брачыслаў апярэдзіў Яраслава і нанёс удар па Ноўгарадзе. Выдатным па выніках трэба назваць гэты паход на Ноўгарад. Брачыслаў хутка сабраў моцнае войска, імкліва рушыў на Ноўгарад і ўзяў яго. Паводле польскага храніста Яна Длугаша, Брачыслаў авалодаў усім Наўгародскім княствам і паставіў у гарадах сваіх намеснікаў. Відавочна імкненне Брачыслава не проста падарваць магутнасць суседняга княства, а пазбавіць яго палітычнай незалежнасці і поўнасцю далучыць да Полацкага княства. У Ноўгарадзе Брачыслаў таксама пакінуў свайго намесніка і з вялікім палонам выступіў у Полацк. На рацэ Судоме палачан сустрэў з войскам кіеўскі князь Яраслаў. Адбылася бітва, і перамог Яраслаў. Быў заключаны мір. Брачыслаў вызваліў Наўгародскае княства, а Яраслаў узамен перадаў яму гарады Віцебск і Усвят — важныя цэнтры на гандлёвых шляхах.

Аднак «Сага...» маўчыць пра бітву. Паводле яе, варагі з Эймундам падпільнавалі і захапілі ў палон Яраслававу жонку Інігерд. Таму Яраслаў, каб вызваліць яе, вымушаны быў пайсці на перамовы і ўступіць Віцебск і Усвят. Звесткі «Сагі...» уяўляюцца нам больш праўдзівымі за летапісныя. Не трэба забываць, што кіеўскія летапісы маглі проста прыпісаць «перамогу» свайму князю. Падобнага роду фальсіфікацый шмат у летапісах.

Паход Брачыслава прынёс свае важныя вынікі. Полацкая зямля даходзіла да вярхоўяў Заходняй Дзвіны і Дняпра, што дазволіла палачанам кантраляваць гэты ключавы адрэзак вялікага гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі», г. зн. з краін Скандынавіі ў Візантыю. Нельга адмаўляць сцвярджэнне сагі, што Яраслаў уступіў Брачыславу кіеўскі пасад. З летапісаў вядома, што Яраслаў нейкі час жыў у Ноўгарадзе і кіраваў Кіевам праз сваіх намеснікаў. Верагодна, на Русі ўсталяваўся дуумвірат. Брачыслаў правіў у Кіеве. На гэта можа ўказваць яго згода быць з Яраславам «знадзін», а таксама наяўнасць у Кіяеве «двара Брачыслаўля». Пэўна, нядоўга прасядзеў Брачыслаў у Кіеве і вярнуўся ў Полацк. Інтарэсы Бацькаўшчыны былі вышэй за палітычныя амбіцыі і хвіліннае задавальненне самалюбства.

Пры Брачыславе Полацкая зямля афармляецца як самастойная, незалежная дзяржава. Магчыма, Брачыслаў пашырыў яе межы на паўночны захад. У гэтым кірунку знаходзім шэраг населеных пунктаў, якія носяць ягонае імя (а значыць, ён заснаваў іх). Перш за ўсё гэта горад Брачыслаўль (Браслаў), Браслаў (Абрэнскі раён у Латвіі), Браслаў за 20 км на поўнач ад Оршы.

І, што самае важнае, у час праўлення Брачыслава Полацкая зямля не спазнала варожых нашэсцяў — рэдкі перыяд у гісторыі старажытнай Беларусі. І за гэта Брачыслава можна назваць Вялікім, бо самая вялікая заслуга ўладара перад народам — захаванне міру і спакою на роднай зямлі.

**Віктар ЧАРОПКА.**

# МАКАЎЕ НА КРЫНІЦЫ











*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Крынічка выглядае просценька — унізе два стаўкі, каплічка, наверсе — крыж. Макавейская традыцыя ўсё роўна не забываецца: як і ў былыя часы, пілігрымы нясуць да вады кветкі, мёд і... морку. Лічыцца, што морква, намочаная ў крыніцы або палітая вадой з яе, набывае гаючыя ўласцівасці. А бацвінне трэба сушыць і захоўваць як абярэг.

У мінулую нядзелю на Макавея людзі з Журавічаў, Хатоўні, Ільіча, Доўска, Званца, Веці, Абідавіч, нават з Рагачова і Чачэрска, сабраліся каля гутнянскай крыніцы, абліваліся вадой, палуднавалі. Жыхарка пасёлка Ільіч Серафіма Куксова — адна з захавальніц гэтага сакральнага месца, набожная і міласэрная жанчына — у гэты дзень спякла мядовыя караваі і, як у былыя часы, раздавала іх наведвальнікам фэсту.

— Каб успаміналі гэтае свята і не забывалі традыцыю, — кажа Серафіма Мікалаеўна. — Так было і ў нашым дзяцінстве.

Захавальніца гутнянскай крыніцы нагадала старажытную назву гэтага ўрочышча — Чарніцова крыніца. Расказала, чаму яна так называлася:

— У гэтым балотным месцы жыў самотны манах, пра яго казалі: чорны. Манах быў краўцом, маліўся ў капліцы. Калі капліцка правалілася, на яе месцы і ўтварылася крыніца.

Цяперашняя капліцка ў раўчуку — таксама стара, яе збудаваў дзед Серафімы Куксовай Іван Гонтараў. Баба Серафіма хоча, каб людзі не адварочваліся ад веры, берaглі сваю крыніцу, падрымлівалі парадак. Жыхары навакольных вёсак таксама не супраць збіраць грашовыя ахвяраванні для рамонту і ўпарадкавання суседскай плошчы. Яны вераць, што вернуцца тыя часы, калі на Чарніцовай крыніцы на Макаўе зноў адродзіцца мядовы кірмаш.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
*anatol@zviazda.by*

**Яшчэ больш фота глядзіце на сайце zviazda.by.**